ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 8 (976) | ПЯТНІЦА, 10-га студзеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Інформацыйнае паведамленьне

3-8 студзеня адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б. Пленум разглядзеў наступныя пытаньні: 1) аб колектывізацыі сельскае гаспадаркі БССР і задачах веснавой с.-г. кампаніі, 2) аб матар'яльным становішчы і культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых, 3) аб соцыялістычнай рэконструкцыі і задачах КП(б)Б на ўзмацненьне кадраў, 4) аб рабоце ЛКСМБ і задачах партыйнага кіраўніцтва комсамолам, 5) організацыйныя пытаньні. Адпаведныя рэзолюцыі пленуму будуць надрукаваны.

Апрача таго пленум заслухаў інформацыю аб пазіцыі т. Чарвякова ў барацьбе з правым ухілам і нацыянал-дэмократызмам, цалкам і поўнасьцю адобрыў усе пастановы бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК, а таксама сакратарыяту ЦК па гэтаму пытаньню.

Пленум аднагалосна абраў першым сакратаром ЦК КП(б)Б тав. Гэя К. В., а таксама пастанавіў кооптыраваць т. Рапапорта ў члены ЦК і абраць яго ў члены бюро ЦК.

Пленум ЦК у сувязі з водзывам т. т. Кarкліна, Пілара і Кажаўнікава ў распараджэньне ЦК УсеКП(б) для адказнай працы пастанавіў лічыць гэтых тав. выбыўшымі з ЦК. Пленум пастанавіў перавесьці тав. Аронштама з кандыдатаў у сябры бюро і абраць ў склад бюро ЦК тав. Бэнэка.

Пленум пастанавіў у замен выбыўшых сяброў ЦК абраць у ЦК т. т. Лацыса, Бялугу, Амбражунаса.

Справа здрадніка Бесядоўскага

Сьледзтва аб здрадніцтве яшчэ ня скончана

МАСКВА, 9. 7-га студзеня ў Вярхоўным Судзе СССР на адкрытым судовым паседжаньні пачалася слуханьнем справа Бесядоўскага.

Былы саветнік паўпрэдства СССР у Францыі Бесядоўскі абвінавачваецца ў прысваеньні і растраце дзяржаўных грашовых сум у разьмеры 15270 даляраў, гэта значыць у злачынстве, якое прадугледжана другой часткай 116 арт. Крымінальнага Кодэксу РСФСР.

Абвінавачваемы, ня гледзячы на ўручэньне яму позвы, у суд не зьявіўся. Справа слухаецца завочна. У позьве, уручанай Бесядоўскаму, яму прапануюць выбраць сабе абаронцу з ліку членаў маскоўскіх абаронцаў, але абвінавачаемы адхіліўся і ад выбару абаронцы.

Член калегіі НК РСІ СССР тав. Ройзенман, дапрошаны судом у якасьці сьведкі паказаў, што ён прыбыў у Парыж 2 га кастрычніка 29 го у для фінансавай рэвізіі. Рэвізія паказала, што Бесядоўскі сапраўды растраціў 15270 даляраў.

Бесядоўскі дайшоў да поўнага маральнага разлажэньня, гаворыць тав. Ройзэнман, і калі ён даведаўся што яго зьнімаюць з пасады саветніка, ён адмовіўся выехаць у Маскву.

Дапрошаны ў якасьці сьведкі родны брат абвінавачанага, катэгорычна адвяргае заяву абвінавачанага на старонках буржуазнага друку аб тым, што яго сям'я падпарадкаваецца прасьледваньням.

Сьведка гаворыць, што ні ён, ні іншыя родныя Бесядоўскага не падпарадкаваліся ніякім прасьледваньням і знаходзяцца на волі.

Брат Бесядоўскага заяўляе, што ён яшчэ з 1925 году пры асабістых спатканьнях з абвінавачаным бачыў, што той сходзіць з правільнай рэволюцыйнай лініі, ухіляецца ад якіх-бы то ні было гутарак па політычных пытаньнях.

Абвінавачваемы сын гандляра гатовага адзеньня. У пачатку рэволюцыі ён быў членам кадэцкай партыі. У 1918 годзе ён наведваў анархісцкія гурткі, у 1919 годзе быў сэкратаром баўгарскага губэрскага комітэту партыі левых эсэраў „лэрдыстых", якія затым увайшлі ў компартыю. Абвінавачваемы Бесядоўскі ў залежнасьці ад абставін прымазаўся да партыі, як беспрынцыпны кар'ерыст. Ён быў да рэволюцыі ў Францыі. аднак выехаў туды ня ў выніку прасьледваньня за рэволюцыйную дзейнасьць. як ён аб гэтым заяўляе. а проста з мэтаю паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову, бо ў царскай Расіі яўрэям доступ у вышэйшую школу быў абмажован.

Я.—заяўляе ў заключэньне сьведка,—ацэньваю паступак майго брата Бесядоўскага, як здрадніцкі і патрабуе суровага пакараньня.

Далей былі агалошаны паказаньні шэрагу супрацоўнікаў паўпрэдзтва СССР у Францыі як савецкіх, так і французскіх грамадзян.

З гэтых паказаньняў вырысоўваецца ганебнейшы малюнак паводзін Бесядоўскага, які вёў сваё жыцьцё разгульна. Перад судом прайшлі шматлікія паходжаньні Бесядоўскага. які прападаў з аўтамабілем на цэлыя дні з поўпрэдзтва без суправаджэньня шофэра.

У выніку заслуханых паказаньняў, Вярхоўны Суд прышоў да заключэньня, што Бесядоўскі зьяўляецца здраднікам. які вёў сваю здрадніцкую работу ўжо даўно. Але дзякуючы таму, што сьледзтва аб здрадніцтве яшчэ ня скончана. Вярхоўны Суд прымушан судзіць Бесядоўскага пакуль толькі як растратчыка.

Вярхоўны Суд знайшоў даказаным прысваеньне і растрату Бесядоўскім 15270 даляраў і на падставе другой часьці 116 арт. Крымінальнага Кодэксу РСФСР прызнаў Бесядоўскага падлягаючым пазбаўленьню волі на 10 год з конфіскацыяй усяе маемасьці і з пазбаўленьнем на ўсіх політычных і грамадзкіх правоў на 5 год.

Дзеньнік пленуму ЦК ЛКСМБ

8 студзеня ў памяшканьні ЦК КП(б)Б адкрыўся чарговы пашыраны пленум ЦК ЛКСМБ.

Пленум заслухаў даклад прадстаўніка ЦК УсеЛКСМ тав. ПАНЦЮХОВА аб выніках агляду ЛКСМБ. Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі, у якіх прынялі ўдзел 7 чалавек.

Учора з раніцы да абедзенага перапынку ішоў праця спрэчак па дакладу тав. Панцюхава.

На вячэрнім паседжаньні пленум заслухаў заключнае слова т. Панцюхова і даклад Наркамзема БССР т. РАЧЫЦКАГА і садаклад тав. АЗАРОНКА аб рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і задачах ЛКСМБ

Сёньня з раніцы працяг спрэчак па дакладу тав. Рачыцкага і садакладу тав. Азаронка.

Учора на вячэрнім пасяджэньні з прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гэй, опатканы воплескамі, якія перайшлі ў овацыю.

Прамова т. Гэя, даклад т. Панцюхова і спрэчкі будуць зьмешчаны ў заўтрашнім нумары нашай газэты.

АДКРЫЎСЯ 8-МЫ ПЛЕНУМ ЦСПСБ

9 студзеня ў памяшканьні ЦСПСБ адкрыўся чарговы пленум Цэнтральнага савету профэсыянальных саюзаў Беларусі.

На ранішнім пасяджэньні пленум заслухаў даклад старшыні ЦСПСБ тав. Рыжова аб выніках 3-га пленуму УсеЦСПС і далейшых задачах. У спрэчках па дакладу выказалася каля 21 чалавек.

Сеньня пленум заслухае даклад старшыні ВСНГБ тав. Грысевіча.

У Гаазе



Зблiжэньне народаў

Па сьлядох цьвёрдалобых

альбо „разбраеньне" па мадканальдаўску

ЛЁНДАН, 8. Орган компартыі „Дэйлі Уоркер" паведамляе, што ўрад Макдональдэ наперакор красамоўным фразам, на справе вядзе вайсковую падрыхтоўку.

Газэта падкрэсьлівае, што ліхарадачнае патырэньне мэханізаваных часьцей арміі якое праводзіцца вайсковым міністэрствам, накіравана выключна супроць Савецкага Саюзу.

Працэс фабрыкантаў фальшывых чырвонцаў

Неабходна выкрыць усе тайны антысавецкіх махінацый

Выкрыць тайныя організацыі

БЭРЛІН. 8. На працэсе фабрыкантаў фальшывых чырвонцаў з допыту падсуднага Карумідзэ высьвятляецца, што ПАДРОБШЧЫКІ ЗНАХОДЗІЛІСЯ Ў ЦЕСНАЙ СУВЯЗІ З ВЯДОМЫМІ НЯМЕЦКІМІ ФАШЫСТЫМІ. у тым ліку—з адным з кіраўнікоў баявой організацыі „Стальны Шлём" Вэбэрам і вядомым організатарам фашысцкіх загавораў капітанам Эрхардтам Яны былі таксама зьвязаны з ВЯДОМЫМ БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІМ АВАНТУРЫСТЫМ АВАЛАВЫМ—БЭРМАНТАМ.

Са слоў падсуднага Садацьершвілі высьвятляецца, што ПАДРОБШЧЫКІ ЎВАХОДЗІЛІ. МАБЫЦЬ, У СКЛАД ЯКОЙСЬЦІ ТАЙНАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ, ЯКАЯ МАЕ МІЖНАРОДНЫ ХАРАКТАР. ГЭТА ОРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНІЧАЛА ЯК СУПРОЦЬ СССР, ТАК І СУПРОЦЬ КОМУНІСТЫЧНАГА РУХУ Ў НЯМЕЧЧЫНЕ. Акрамя таго, гэта організацыя ДАСТАЎЛЯЛА „ВЕСТКІ" (БЯЗУМОЎНА, ХЛУСЬЛІВЫЯ) АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ САВЕЦКАГА ЎРАДУ. Садацьершвілі далей напомніў аб НАРАДАХ ПА „ВАЙСКОВА-ТЭХНІЧНЫХ ПЫТАНЬНЯХ", паміж падробшчыкамі і нямецкімі фашыстымі. Ні старшыня суду. ні прокурор не задалі яму ніякіх пытаньняў з мэтаю высьветліць характар гэтых нарад.

Допыт Садацьершвілі працягваецца.

Патрэбна яснасьць

Фабрыканты фальшывых чырвонцаў усяляк імкнуцца не „прагаварыцца". Тым ня менш, допыт Карумідзэ і Садацьершвілі неабвяржыма паказаў, што падробшчыкі ўваходзілі ў склад організацыі, якая не спынялася ні перад якімі сродкамі ў сваіх спробах барацьбы супроць СССР.

Удзел у гэтай організацыі соцыял-дэмократаў, нямецкіх фашыстых і ангельскіх нафтавікоў не падлягае сумненьню Пры такім „шырокім" характары гэтай бандыцкай організацыі ўпаўне натуральна паставіць пытаньне: ці сапраўды яна ліквідавана арыштам падробшчыкаў, і ці не працягвае яна сваё існаваньне?

Здавалася-б, што абавязак нямецкага суду—суду таварыскай нам дзяржавы—прыкласьці ўсе стараньні да поўнага выкрыцьця ўсіх абставін справы. На вялікі жаль мы наглядаем зараз той-жа малюнак, што і пры мінулагоднім працэсе фабрыкантаў антысавецкіх фальшывак. Суд і прокурор устрымліваюцца ад спробаў пранікнуць у політычныя тайны справы, абмяжоўваючы працэс дробнымі крымінальнымі падрабязнасьцямі. Савецкая грамадзкасьць ня можа быць задаволена такім ходам справы. Яна ў праве чакаць поўнага і ўсебаковага высьвятленьня тых цёмных антысавецкіх махінацый, якія праводзяцца штодзённа нашымі ворагамі ўсіх масьцей і адценкаў. І калі-б нямецкі суд так паступіў, ён тым самым лепш за ўсё даказаў-бы таварыскія адносіны да СССР. Цяперашні малюнак працэсу, на вялікі жаль зусім ня здолеў зрабіць гэта.

Галадоўка чэха-славацкага комуніста Ворлічэка

ПРАГА 8. Комуністы Ворлічэк, які знаходзіцца ў папярэднім зьняволеньні з 7 га кастрычніка 1929 года абвясьціў галадоўку.

Ворлічэк —сэкратар Штраконіцкай акруговай організацыі чэха-славацкай компартыі, быў арыштаваны па западазрэньню ў выпуску нелегальнай лістоўкі. На гледзячы на доўгае прабываньне ў папярэднім зьняволеньні таварышу Ворлічэку да гэтага часу не прад'яўлена ніякага абвінавачаньня. Становішча здароўя тав. Ворлічэка надзвычайна цяжкае.

На КУ чыгунцы

ТОКІЁ. 6. Як паведамляе харбінскі корэспондэнт агенства Сін-Бун Рэнго кіраўніцтва КУ чыгункі абвясьціла, што рух на Усходняй лініі КУ чыгункі аднавіцца 10 студзеня, па заходняй—15 студзеня, а міжнародныя зносіны і агульныя зносіны па КУ чыгунцы 20-га студзеня.

ТОКІЁ. 6. Па паведамленьнях з Харбіну, кіраўніцтва КУ чыгункі паведаміла ва Усурыйскую чыгунку, што КУ чыгунка гатова да аднаўленьня прамога руху на Уладывасток. Папутная на Заходняй лініі КУ чыгунка пасьпяхова рамантуецца.

Забіта 10 тысяч коняй, прыгодных для работы

Колгассаюз сваёй установкай спрыяў разбазарваньню рабочай жывёлы

Спыніць скарачэньне ліку рабочых коняй—задача дню

БЕРАГЧЫ ЦЯГАВУЮ СІЛУ

За кароткі час, пасьля верасьнеўскага пленуму ЦК КП(б)Б мы маем новыя тэмпы росту колектывізацыі. Колектыўны рух зрабіў новы крок уперад. Справа колектывізацыі стала ня толькі справай індывідуальна бядняцкіх, серадняцкіх гаспадарак, але яна пачала ахопліваць вёскі, сельсаветы, раёны.

У вёсны зьменьваецца соцыяльныя і тэхнічныя асновы сельскай гаспадаркі. Рашучы нажым на кулака і ўзмацненьне ўплыву соцыялістычнага сектару сельскай гаспадаркі выклікаюць абвастрэньне клясавай барацьбы. Кулак ня хоча здаць сваіх пазыцый, якія маюць карэньні ў сыстэме індывідуальных гаспадарак, ён больш актыўна выступае супроць мерапрыемстваў партыі і ўлады зьмяняючы мэтады сваёй барацьбы.

Напярэдадні вясеньняй сяўбы кулацтва разгарнула шалёную агітацыю за продаж коняй. кароў, насеньня і сельска-гаспадарчага інвэнтару. Гэтым самым кулацтва імкнецца паслабіць моц колгасных гаспадарак і скарыстаць усе сродкі барацьбы, каб сарваць мерапрыемствы вясеньня-пасяўной кампаніі.

Кулацкая агітацыя надта простая: „распрадайце ўсё"—кажа ён,—„у колгасе дадуць". Такая агітацыя ў некаторых мясцох мае вынікі. Асобныя бядняксі серадняксі пад уплывам кулацкай агітацыі, прадаюць сваіх коняй. якія скупляюцца скурсындыкатам і малочна жывёлагадоўчай коопэрацыяй у большай частцы выключна для ўбоя.

Кіраўніцтва скурсындыкату некальк раз папярэджвала колгасныя органы, каб апошнія вылучылі сваіх прадстаўнікоў з мэтай адборкі годных для працы коняй, але кіраўніцтва КОЛГАССАЮЗУ АБМЯЖОЎВАЛАСЯ ТОЛЬКІ ПРЫНЯЦЬЦЕМ ГЭТЫХ ПРАПАНОЎ ДА ВЕДАМА. НАРКАМЗЕМ І КОЛГАССАЮЗ НІЧОГА НЕ ЗРАБІЛІ, КАБ ПАПЯРЭДЗІЦЬ МАСАВАЕ СКАРАЧЭНЬНЕ ЛІКУ КОНЯЙ. Колгассаюз лічыў, што нашы колгасы ўжо забясьпечаны дастатковай цягавай сілай, чым спрыяў пашырэньню зьявішча масавага забойства коняй і распрадажы жывёлы раней існаваўшымі колгасамі і гаспадаркамі, якія ўноў аб'ядноўваюцца ў колгасы.

За сьнежань месяц 1928 году было загатоўлена 16 тысяч конскіх скур. а за сьнежань 1929 году загатоўлена КОНСКІХ СКУР ДА 35 ТЫСЯЧ, прычым, у гэтым ліку ЗАБІТА КАЛЯ 30 ПРОЦ. КОНЯЙ, ЯКІЯ ПРЫГОДНЫ ДЛЯ ПРАЦЫ. Прыведзеная лічба прымушае констатаваць, што мы не мобілізавалі грамадзкасьці навокал пытаньня, аб захоўваньні жывёлы і сродкаў вытворчасьці колектывізаванай беднаты і серадняка; што мы не ўлічылі магчымасьць такога становішча на гэтым вучастку нашага будаўніцтва.

Месячнік жывёлагадоўлі комсамольская організацыя і ўся савецкая грамадзкасьць павінна скарыстаць для працы, якая сваім вынікам мела-б зьнішчэньне зьявішча масавага разбазарваньня кароў і коняй, каб сваёй працай даць зразумець селяніну, бедняку і серадняку, які ідзе ў колгас, ШТО РАСПРОДАЖ ІМІ СРОДКАЎ ВЫТВОРЧАСЬЦІ. ЯКІЯ МЕЛІСЯ Ў ІХ ГАСПАДАРКАХ ДА ЎСТУПЛЕНЬНЯ Ў КОЛГАС—ЁСЬЦЬ ДАПАМОГА КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ Ў БАРАЦЬБЕ З КОЛЕКТЫВІЗАЦЫЯЙ.

ПРЫПЫНЕНЬНЕ РАСПРОДАЖЫ ЖЫВЁЛЫ І ЗАБОЮ КОНЯЙ ПРЫГОДНЫХ ДЛЯ ПРАЦЫ—НЕАДКЛАДНАЯ ЗАДАЧА ДНЮ. НЯ ВЫКАНАЦЬ ГЭТАГА, Г. ЗН. НЯ ВЫКАНАЦЬ ТЫХ ЗАДАЧ, ЯКІЯ ПАСТАЎЛЕНЫ ПЕРАД НАМІ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНІ ВЯСНОВАЙ ПАСЯЎНОЙ КАМПАНІІ.

Г.

ЗА СЬНЕЖАНЬ МЕСЯЦ ЗАБІТА 35 ТЫСЯЧ КОНЯЙ

Лічбы беларускай канторы скурсындыкату кажуць аб нячуваных фактах разбазарваньня буйнай рагатай жывёлы і коняй.

За кастрычнік месяц 1928 году аддзяленьнямі Белкурсындыкату было загатоўлена 34 тысячы скур буйнай рагатай жывёлы, а за кастрычнік месяц 1929 года — 38 тысяч скур.

Такія-ж паказчыкі мы наглядаем у распродажы коняй. За кастрычнік 1928 году было загатоўлена конскіх скур 3000 і за сьнежань—16 тысяч, а за кастрычнік 1929 году 3800 скур і ЗА СЬНЕЖАНЬ 35 ТЫСЯЧ СКУР.

Гэтыя лічбы кажуць аб тым, што мы не своечасова мобілізавалі ўвагу грамадзкасьці на гэты вучастак работы, што некаторыя мясцовыя організацыі яшчэ не змаглі даць рашучага адпору кулацкай агітацыі і не разгарнулі растлумачальную працу сярод бядняцка-серадняцкага насельніцтва, аб шкоднасьці распродажу жывёлы і сельска-гаспадарчага інвэнтару.

Комсамол, грамадзкія організацыі павінны безадкладна прыступіць да правядзеньня растлумачальнай работы, за захаваньне сродкаў вытворчасьці пры ўваходзе ў колгасы.

Х. Б.

Што паказвае падрыхтоўчая работа да зьлёту „ЛК“

У падрыхтоўчую працу да зьлёту „Лёгкай Кавалерыі“ Койданаўскага раёну (Меншчына) была ўведзена галоўным чынам практычная работа. Частка атрадаў зрабілі налёты на прадпрыемствы. Напрыклад, атрад „ЛК“ пры саўгасе „Негарэлае“ зрабіў налёт на сваю гаспадарку, дзе выявіў шмат недарэчнасьцяў.

На сёньняшні дзень гаспадарка знаходзіцца ў поўразваленым выглядзе. Да пасеўкампаніі і ня думае рыхтавацца, ведаючы вопыт правалу пасеўкампаніі мінулага году. Гаспадарка ня выплаціла пэнсіі штатным рабочым за месяц, а сэзонным за тры месяцы, што складае запазычанасьць у 1100 р. Спэцвопратка рабочым у мінулым і ў гэтым годзе ня выдадзена.

Гаспадарка мае запазычанасьць страхкасе 900 р. і за гэту запазычанасьць кожны месяц плоціць пені па 30 р. На днях прыбыло для гаспадаркі па чыгунцы ўгнасьне і іншыя прэпараты к вясновай сяўбе, але да гэтага часу ня выкуплены за адсутнасьцю сродкаў, за прастой і хаваньне на чыгунцы гаспадарка павінна плаціць.

У гэтым годзе гаспадарка павінна была набыць жывёлу, гэтага ня выканана і трэст таксама аб гэтым ня думае.

Культмасавая работа адсутнічае, гаспадарка павінна рабачкому 50 р. Комсамольская ячэйка мірылася з такім становішчам. Члены партыі і рабочыя бягуць з гаспадаркі. Аб становішчы гаспадаркі райком партыі слухаў пяць рэз даклады па працягу 1929 г., але пастановы заставаліся толькі дакумантамі, ніхто да іх не прыслухоўваўся, і асабліва Белсельтрэст. АКК РСІ павінна гэтым заняцца.

Местачковая ячэйка пры саюзе сельгаслесрабочых выкрыла факты скрыўленьня клясавай лініі ў арцелі шаўцоў „Праца“. Старшы майстар гэтай арцелі на нізка-аплачваемую работу ставіў беднякоў, беднякам даваўся дрэнны тавар.

У арцелі возьнікаў выявілася разлажэньне, п'янства, у арцелі зроблены датэрміновыя перавыбары бюро парт'ячэйкі.

У сельска-гаспадарчым таварыстве крамнік Гінзбург выдаваў дэфіцітныя тавары пазбаўленцам-кулакам. Складаныя машыны стаялі пад адкрытым небам і псаваліся.

Соцыялістычнае спаборніцтва у падрыхтоўчай працы да зьлёту разгорнута слаба, напрыклад, ячэйка Сельгаслесрабочых паслала догавар ячэйцы ЛКСМБ пры месцсавеце, але гэта ячэйка і да сёньняшняга дню догавар не прыняла і падрыхтоўчай работы па зьлёту „ЛК“ не разгарнула.

Парайкаўская ячэйка выпрацавала соцыялістычны догавар, але ніяк не зьбярэцца абгаварыць яго на сходзе.

Ячэйка ЛКСМБ комуны „Чырвоны Сьцяг“ толькі з 6-га студзеня пачала рыхтавацца да зьлёту „ЛК“ у той час, калі зьлёт пазначан на 11-І. У сакратара ячэйкі ёсьць думка, што атраду „ЛК“ у комуне няма чаго рабіць у той час, калі ў комуне безгаспадарна валяюцца машыны, вытворчы плян пасяўной кампаніі не падрыхтован, комунары аб гэтым нічога ня ведаюць і ячэйка таксама нічога ня робіць.

Раённы штаб „ЛК“ уступіў з ячэйкамі у соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да зьлёту. Вызначана чатыры прэміі, якія будуць аддадзены тым ячэйкам, якія лепш падрыхтуюцца да зьлёту.

Полей.

ПАБУДАВАЦЬ ТРАКТАРНУЮ КАЛЕНУ

17000-ая армія комсамолії Меншчыны праводзіць 2-хдзёньнік трактарызацыі

ТРАКТАРНАЙ КАЛЁНАЙ ІМЯ „МЕНСКАГА КОМСАМОЛУ“ ЗРУЙНУЕМ СОТНІ МЕЖ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ГАСПАДАРАК

ДВУХДЗЕНЬНІК ТРАКТАРЫЗАЦЫІ

Пастанова Сэкратарыяту Менскага АК ЛКСМБ

1. З мэтай большага ўцягненьня комсамольцаў, працоўнай моладзі і ўсей грамадзкасьці ў справу непасрэднага ўдзелу ў соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ў прыватнасьці, уцягненьня сродкаў працоўнага насельніцтва ў **трактарнае будаўніцтва** лічыць неабходным правядзеньне збору сродкаў **на арганізацыю аднэй трактарнай калёны імя менскага комсамолу**.

2 Для практычнай рэалізацыі гэтага організаваць у тэрмін з 1-га па 15-е лютага двухдзеньнікі трактарызацыі сельскай гаспадаркі пад лёзунгам: „кожны комсамолец акругі павінен **адпрацаваць два дні** ў карысьць трактарнай калёны».

3. Уся вясковая організацыя працу двухдзеньніку праводзіць на вучастках лесараспрацовак. Райкомы, па ўзгодненасьці з загатоўчымі організацыямі Лесбелу, устанаўліваюць парадак (чарговасьць) выхаду на работу ячэяк з такім разьлікам, каб ячэйкі раёну выходзілі ня ўсе разам, а па чарзе — 4,5 зьмен. Комсамольцы, мобілізаваныя на лесараспрацоўкі, павінны ў выгляд суботніка адпрацаваць два дні карысьць калёны. Гэта работа п[...] вінна быць зьвязана з узды[...] грамадзкай увагі вакол лесаза[...] зак, і наогул, вакол выканан[...] плянавых заданьняў як выруб[...] так і вывазкі.

4. Збор сродак у фонд трак[...]рызацыі комсамольскія організа[...] Менску і Барысаву праводз[...] шляхам організацыі суботнікаў (р[...] грузка дроў і інш.) збор уціль-с[...]равіны. Прапанаваць Кастрыч[...]каўскаму, Фрунзаўскаму і Барыс[...]скаму райкомам, па дагаворанас[...] з гаспадарчымі організацыямі, [...] значыць парадак работ і выха[...] на іх комсамольцаў, беспартыйн[...] рабочай моладзі і дарослых.

5. Прапанаваць усім РК п[...]таньне аб 2 дзеньніку, абгавары[...] на сходах усіх комсамольскіх ячэ[...] прыцягнуць на іх калгасную, б[...]ніцка-серадняцкую моладзь і [...]рослых. Райкомам у час райкон[...]рэнцыі правесьці нарады сэкра[...]роў ячэяк, дзе спэцыяльна абм[...]каваць гэта пытаньне з тым, [...] выхад на работу (організацыя бр[...]гад, арцеляў) так і організа[...] самой работы была **падрыхтава[...] загадзя** і забесьпечыла бесп[...]бойнасьць ува ўсей працы 2-[...]дзеньніку.



Маладыя трактарысты

Дамо вёсцы сталёвых коняй

Да ўсіх культурна-мастац[...]кіх устаноў і організацы[...] Менску, працаўнікоў тэат[...] кіно і клюбаў

Сучасныя тэмпы соцыялістычн[...] рэконструкцыі сельскай гаспада[...] патрабуюць максымальнага р[...]гортваньня сельска - гаспадарч[...] машынна - будаўнічай прамысл[...]васьці. Патрэбна максымальн[...] павялічэньне сродкаў на тракт[...]нае будаўніцтва.

Менскі комсамол узяў на ся[...] абавязак з 1 па 15 лютага пр[...] весьці двухдзёньнікі трактары[...]цыі пад лёзунгам: „Менская ор[...]нізацыя комсамолу павінна да[...] трактарную калёну соцыялісты[...]наму сэктару сельскай гаспадарк[...]

Практычна гэта ажыцьцявіц[...] выхадам усёй вясковай організ[...]цыі акругі-на суботнік па загат[...]цы лесаматар'ялу на два дні [...] організацыяй суботнікаў у горад[...]

Мы лічым, што ў ажыцьця[...]леньні гэтага мерапрыёмства п[...]вінны прыняць удзел усе ку[...]турныя і мастацкія ўстановы г[...] Менску (тэатр, кіно, клюбы).

Мы выклікаем працаўнікоў тэ[...]ру, кіно і клюбаў на організац[...] ў кожным з іх аднаго платн[...] вечару (пастаноўку Еўтэатр[...] тэатрам Галубка, клюбамі і кі[...] сэансаў кожным кіно) у фонд [...] трактарную калёну.

Мы спадзяемся, што ўсе гэт[...] організацыі ў асноўнай сваёй ма[...] якія ў мінулым адгукаліся на [...]клік комсамолу, асабліва ў [...] культпаходу, а зараз — у трох[...]сячнік беларускай пролетарск[...] культуры і культуры нацменша[...]цяў, прымуць і гэты наш выклі[...]

Спадзяемся, што ваша дапамо[...] ў гэтым узброіць новую колгасн[...] вёску некалькімі сталёвымі [...]нямі.

Па даручэньню бюро А[...] ЛКСМБ— сэкратар АК
МАСЛОЎСКІ.

Міжнародны комуністычны рух моладзі на гістарычным павароце

Да ўсіх сэкцый КІМ'у, да ўсіх членаў комсамолу

(З адкрытага лісту Выканкому КІМ'у)

ТАВАРЫШЫ! Пашыраны пленум Выканкому Комінтэрну Моладзі, які супаў з 10-цігодзьдзем Комуністычнага Інтэрнацыяналу Моладзі, прыняў вялізарнай важнасьці рашэньні.

Яны маюць для нашага руху гістарычнае значэньне, бо вызначаюць круты пералом да сапраўднай масавай работы, паказваюць верныя шляхі барацьбы за рабочую моладзь, орыентуючы ўвесь рух на нарастаньне новага рэволюцыйнага ўздыму.

Пленум пастанавіў зьвярнуцца да вас з гэтым лістом, бо справа ператварэньня КІМ'у ў сапраўды масавую баявую організацыю рабочай моладзі цалкам і поўнасьцю знаходзіцца у вашых руках.

На рашучую барацьбу за зьнішчэньне асноўных недахопаў КІМ'у

Ленін вучыў нас ня скрываць сваіх недахопаў, сьмела глядзець у твар цяжкасьцям. Сьледуючы гэтаму завету бальшавізму, пленум КІМ'у зьвяртаецца да вас і заклікае вас на рашучую барацьбу за зьнішчэньне асноўных недахопаў КІМ'у за ператварэньне яго ў масавую організацыю.

Сучаснае становішча КІМ'у прымушае нас забіць трэвогу. Капіталістычны сьвет з усё большай шпаркасьцю ідзе насустрач гіганцкім клясавым баям.

Новы рэволюцыйны ўздым шпарка нарастае як у перадавых краінах капіталізму, так і ў калёніях. Магутныя стачкі, баявыя політычныя дэмонстрацыі, а ў шэрагу месц і барыкады сьведчаць аб тым, што пролетарыят адказвае на наступленьне капіталу магутнымі контратакамі.

У гэтай барацьбе клясаў, якая асабліва абвастраецца рабочая моладзь грае ролю аднаго з баявых перадавых атрадаў рабочай клясы.

Ня гледзячы на тое, што ўсё больш спрыяючымі становяцца абставіны для ахопу пад сьцягамі комунізму самых шырокіх організаваных і неорганізаваных мас рабочай моладзі, лік членаў КІМ'у падае на 20 проц. у параўнаньні з лікам да V конгрэсу, некаторыя з сэкцый як Англія, Чэха-Славакія перажываюць сур'ёзьнейшы політычны і організацыйны крызіс. Амаль усе сэкцыі КІМ'у ў пяцьшэсьць разоў менш суадпаведных компартый.

Ленін вучыў нас, што комсамол павінен быць школай комунізму для працоўнай моладзі.

Гэта значыць, што ён павінен выхоўваць і ахапляць у сваіх шэрагах самыя шырокія пласты рабочай моладзі. рыхтуючы з яе магутны рэзэрв для партыі, увязваючы пры гэтым кожны крок рэволюцыйнага выхаваньня з штодзённай барацьбой рабочай клясы. Але трэба адкрыта сказаць, што гэта ленінскае палажэньне на справе намі ня выканана, што і прывяло шэраг сэкцый да іх сучаснага становішча.

За бязьлітасную барацьбу супроць ухілаў ад правільнай бальшавіцкай лініі

Побач з сур'ёзнымі опортуністычныі хістаньнямі ў былых кіраўніцтвах шэрагу саюзаў (Нямеччына, Чэха-Славакія, Швэйцарыя) і комсамольскіх організацыях, часьцей і больш рэзка праяўляліся тэндэнцыі гурткоўшчыны, замкнутасьці і ізоляцыі ад шырокіх мас рабочай моладзі, прыкрываемыя „левай“, а па сутнасьці справы дробна-буржуазнай фразай.

У комсамольскіх організацыях існуе палахлівасьць мас, не жаданьне і ня ўменьне працаваць у масавых варожых організацыях, зьневажаньне заветаў Леніна, якія вучаць комуністых працаваць усюды, дзё ёсьць рабочая маса.

Па гэтаму ўпяршыню ў гісторыі КІМ'у наш пленум паставіў з такой яснасьцю і чоткасьцю пытаньне аб „левым“ ухіле, аб радыкальнай фразе, якія зьяўляюцца галоўнай перашкодай да ператварэньня КІМ'у ў масавую організацыю.

Наш пленум даў сакрушаючы ўдар, як па опортуністычных элемэнтах, якія імкнуцца павярнуць рух на шлях капітуляцыі перад буржуазіяй, і па прымірэнцтву да іх, таксама і па „левых“ фразёрах, якія прыкрываюць сваю опортуністычную бездапаможнасьць псеўда-радыкальнымі фразамі.

Галоўны ўдар комсамол павінен па-ранейшаму накіроўваць супроць правых опортуністых, але адначасова ён павінен нанесьці сакрушаючы ўдар па поўтрацкістскіх настроях, тэндэнцыях „левага“ сэктанства, „левай“ фразе, якія дэморалізуюць шэрагі комсамолу.

Бязьлітасная барацьба супроць ухілаў ад правільнай бальшавіцкай лініі зьяўляецца асноўнай спасылкай ажыцьцяўленьня павароту КСМ.

Шырокая ініцыятыва комсамольскай масы—рашаючая ўмова ажыцьцяўленьня павароту

Роўным чынам, рашаючай умовай ажыцьцяўленьня павароту зьяўляецца самая шырокая ініцыятыва ў гэтай справе ўсёй комсамольскай масы.

Шпаркі, рашучы паварот комсамол зробіць, калі за гэтую справу возьмецца, таварышы, кожны з вас, калі не застанецца ніводнага комсамольца, які не працаваў бы актыўна ў фабрычнай ячэйцы, у профсаюзе, спортыўнай організацыі, які ня стаў-бы павадыром моладзі ў любой экономічнай стачцы альбо політычным выступленьні.

Мы заклікаем вас разгарнуць шырокую безбаязную самакрытыку „ня гледзячы на асобы“.

Вы павінны стварыць ва ўсіх організацыях КІМ'у ў кожнай ячэйцы і групе атмасфэру жорсткага кантролю за правядзеньне рашэньняў пленуму КІМ'у ў жыцьцё. Вы павінны абвясьціць бязьлітасную і непрымірымую барацьбу ўсім балбатунам аб павароце, якія на практыцы нічога ня робяць. Выкрывайце факты сабатажу, няшчырасьці пры правядзеньні павароту, выкрывайце актывістых, якія адрываюцца ад мас і не жадаюць весьці сярод іх работу. Зьнімайце такіх актывістых з іх пастоў, гэніце вон усіх фразёраў, а на іх месца вылучайце рабочых комсамольцаў, якія прайшлі школу апошніх экономічных і політычных баёў пролетарыяту, якія зьяўляюцца сапраўднымі павадырамі рабочай моладзі на заводзе і фабрыцы ў часе стачкі, на вуліцы ў часе дэмонстрацыі і барацьбы з паліцыяй.

Ганьбай для нас зьяўляюцца тыя абставіны, што інтэнсыўнасьць нашай антымілітарысцкай работы надзвычайна пала ў параўнаньні з мінулым.

Па гэтаму ўзмацняйце гэтую работу, стварайце ў арміі і флёце комсамольскія ячэйкі, папулярызуйце лёзунгі Леніна і Лібкнэхта аб барацьбе з вайною.

Стварайце фабрычна - заводзкія ячэйкі на ўсіх заводах і фабрыках, а асабліва на кожным буйным прадпрыемстве. Вывучайце рашэньні пленуму. Зрабеце іх здабыткам шырокіх мас.

ТАВАРЫШЫ! Міжнародны Комуністычны рух моладзі ўтварае зараз гістарычны паварот. Кожны комсамольскі актывіст, кожны комсамолец павінен ведаць, што гэты паварот вызначыць развіцьцё КІМ'у на многія гады і нашу баявую падрыхтоўку да рашаючай барацьбы за пролетарскую рэволюцыю, за комунізм. Абавязкам комсамолу зьяўляецца ўзяць на сябе кіраўніцтва ўзрастаючай барацьбой рабочай моладзі.

Наперад-жа, таварышы! За работу! На фабрыкі і заводы! У масавыя організацыі! За заваяваньне большасьці рабочай моладзі!

ВЫКАНАЎЧЫ КОМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ МОЛАДЗІ.

Трохмесячнік беларускай пролетарскай культуры і культуры нацменьшасьцяў

За пролетарскае мастацтва

Мастацтва у масы і масы у мастацтва

У дні комсамольскіх сьвят бадзёрасьць, весельле тысячамі маладых галасоў расплёскваецца па вуліцах. На плошчы, у коле заліхвацка вывядзе заспявала: «На Кавказе есть гора», сьпяшаючыся падкопяць прыпеў, пачнуцца скокі. А падыходзячыя да плошчы ячэйкі, пясуць іншыя сьпевы. Прарвуцца выкрыкі „Каробушки“, „Кузнецов“, „Баразенькі вузенькай“, шмат разоў перапетых сьпеваў.

Новых сьпеваў мала і іх моладзь ня ведае. Няма каму азнаёміцца з нотамі, вывучыць словы. Мала хто думае аб тым, якую шкоду прыносяць словы аб бірузовых пярсьцёнках, пары піва і вочцы каранькай, на што настрайваюць моладзь шансанэтныя матывы.

Многія рэволюцыйныя словы ўціснуты ў пахабныя матывы царскіх казармаў, рэсторанаў і прытонаў. Песьня «Мы комсамол» сьпяваецца на матыў «Свой уголок я убрала цветами». „Мы кавалі“—гэта матыў шансанэтнага сьпеву «Мы шансонетки стреляем метко». Піонэрскі сьпеў „Картошка“ сьпяваецца таксама, як сьпявалі калісьці п‘яныя салдаты ў прытонах: „У варот случилась драка, драка, драка“...

Срод матываў нашых масавых сьпеваў сустракаюцца царкоўныя мэлёдыі, матывы нацыянальных гімнаў.

Сярод беларускіх масавых сьпеваў няма ніводнага сучаснага, ніводнага рэволюцыйнага.

Рост пролетарскай культуры надзвычайна адсталы ад агульнага росту БССР. Комсамол пытаньнямі мастацкай працы амаль не займаўся. Узброіцца мэтадамі мастацкай агітацыі дзеля выхаваньня новага чалавека, пропаганды ідэй і чарговых задач пролетарыяту, мы яшчэ не змаглі.

Кожны мастацкі твор утвараўся пэўнай кляса. Кожная кляса ўтварала свае спосабы і формы узьдзейнічаньня на пачуцьці людзей, сваю мастацкую агітацыю.

Музыка Бэтговэна—музыка маладой, тады рэволюцыйнай, буржуазіі.

Павольны вальс—соцыяльны танец збэшчанага, выміраючага дваранства. Гімн сучаснага капіталістычнага сьвету—шалёны джас-банд і п‘яначы фокстрот.

Ці кожны твор мастацтва клясавы? Так, выключэньняў няма. Розьніца ў тым, што кожная кляса ставіць перад мастацтвам розныя мэты. Калі пролетарыяту патрэбны заклікі да барацьбы, актыўнасьці, перамогі, дык буржуазія патрабуе ад музыкі, тэатру, кіно, сьпеву, выяўленчага мастацтва—асалоду, мар, заклік да чагосьці „надземнага“. Адсюль буржуазія высоўвае тэзіс аб бясклясавасьці мастацтва, аб мастацтве дзеля творчасьці.

У Беларусі маюцца прыхільнікі гэтага буржуазнага разуменьня мастацтва. Напрыклад, у музтэхнікуме ў якасьці падручнікаў выкарыстоўваюцца царкоўныя адрыўкі. На менскіх пэдкурсах выкладчык музыкі даводзіў, што вялікае значэньне музыкі ў тым, што яна прымірае азьвярэўшых за гады грамадзянск. вайны людзей. Некалькі зьмешчаных у друку артыкулаў аб адрыве музыкі ад сучаснасьці, былі пакінуты бяз увагі. Ніхто не пажадаў абмяркоўваць шляхі пераводу музыкі на савецкія рэйкі.

Задача комсамолу ў трохмесячнік пролетарскай культуры дабіцца рэзкага пералому ва ўсёй мастацкай рабоце, уключыць масы ў барацьбу за пролетарскую культуру.

Нам трэба праверыць клясавы зьмест музычнага выхаваньня ў школах, у музтэхнікуме, музгуртках. Нам трэба рубам паставіць пытаньне перад пісьменьнікамі і компазытарамі аб утварэньні новай масавай песьні. Трэба правесьці шэраг дакладаў і дыспутаў па пытаньнях мастацтва. Комсамол і працоўная моладзь павінны стаць у першых шэрагах барацьбітоў за пролетарскае мастацтва.

Наш лёзунг: „Мастацтва ў масы і масы ў мастацтва!“

Тэатр--мастацкі агітпроп пролетарыяту

Продукцыя дзяржаўных тэатраў Беларусі паляпшаецца з кожным годам. Праўда, вельмі павольна, са зрывамі, хістаньнямі, але ўсё-ж тэатры становяцца ачагамі пролетарскага мастацтва. Патрэбна дапамога і ўдзел масы рабочых у працы тэатраў для таго, каб тэатры сталі сапраўды мастацкімі агітпропамі пролетарыяту, месцам, дзе для агітацыі выкарыстаны ўсе сродкі мастацкага ўзьдзеяньня.

У задачы трохмесячніку будзе ўваходзіць праверка рэпэртуараў тэатраў. Увесь ідэолёгічна-варожы хлам павінен быць выкінуты. Ніякая мастацкая «каштоўнасьць», але з ідэолёгічнымі вывіхамі, ня можа быць пастаўлена на сцэне тэатраў, створаных рэволюцыяй. Новы рэпэртуар трэба старанна абгаварваць на рабочых сходах. Кідаць тысячы на паветра—рыхтаваць пастаноўку і пасьля двух-трох паказаў зьнімаць яе, як было з „Крывой Аблонай“ (БДТ—1), савецкая грамадзкасьць дазволіць ня можа.

Комсамол павінен усебакова абсудзіць шляхі разьвіцьця тэатраў Беларусі. Зараз шэраг пытаньняў па тэатральнай рабоце хвалююць моладзь:

— Да якога часу „разлажэньне“ буржуазіі і нэпманства будзе цэнтрам савецкіх пастановах («Заяюць верацёны», „Барацьба машын“ і „Пінская Мадонна“?)

— Калі-ж на сцэне будзе паказана бадзёрая, энэргічная рабочая моладзь, пакаленьне энтузыястых соцыялістычнага будаўніцтва?

— Калі-ж спэктаклі стануць ня толькі адпачынкам і забавай для гледача, але і мастацкім абгаварэньнем, дыскусыяй па хвалюючых грамадзкасьць і працоўную моладзь пытаньнях?

Пытаньняў шмат. Няясна лінія тэатраў па барацьбе з нацыянальнай абмежаванасьцю. Напрыклад у пастаноўках БДТ няма дзейнічаючых асоб яўрэяў, у ЯДТ—беларусоў. Зусім няма пастановак з інтэрнацыянальным зьместам.

У кожным горадзе, дзе працуе дзяржаўны тэатр, трэба наладзіць дыспут аб шляхох разьвіцьця тэатраў Беларусі. На шэрагу прадпрыемствах абгаварыць даклады кіраўнікоў тэатраў.

Комсамол павінен усур‘ёз узяцца за тэатральную працу. Ячэйковыя колектыўныя паходы ў тэатр практыкуюцца часта. Але-ж колектыўнасьць такіх паходаў часьцей за ўсё выяўляецца толькі ў сумеснай закупцы білетаў. Карысьці ад такога „колектыўнага“ паходу вельмі мала. Трэба ня толькі прагледзіць пастаноўку. Вакол кожнага спэктакля тэатру павінна быць разгорнута вялікая работа Добра да прагляду азнаёміць моладзь са зьместам спэктаклю. Гэта можна зрабіць вывешваючы побач з афішамі на прадпрыемстве рэцэнзіі, водзывы, кароткі зьмест спэктаклю. На тэмы пастановак раіць моладзі літаратуру (напрыклад, па спэктаклі „Ботвін“—аб барацьбе польскага комсамолу).

Пасьля прагляду трэба наладзіць абгаварэньне спэктаклю на ячэйковым сходзе ці на вечары, за „шклянкай гарбаты“. Для ўступнага слова можна запрасіць каго-небудзь з тэатральных працаўнікоў. У канцы абгаварэньня скласьці колектыўную рэцэнзію.

На прадпрыемствах добра организаваць тэатральныя куткі. У такім кутку вывешваюцца афішы, рэцэнзіі, тэатральныя аб‘явы. Тэатральную працу ў ячэйках можна разгарнуць шырока. У гарадох павінны быць створаны атрады „мастацкай лёгкай кавалерыі“. Работа вакол рэпэртуару тэатраў, набліжэньне тэатраў да гледача, дапамога ў ачыстцы тэатраў ад варожых элемэнтаў, шмат работы змогуць выканаць такія атрады „лёгкай кавалерыі“.

Характэрны выпадак, бышы нядаўна ў маскоўскім Малым Тэатры. Заслужаны артысты рэспублікі Садоўскі, выканаўца рэволюцыйнай ролі камісара Кошкіна („Любовь Яровая“) вывесіў у тэатры пахабны малюнак аб соцыялістычным спаборніцтве. Садоўскі быў толькі «спэц», для якога было ўсё роўна, якія ролі выконваць. Ён іграў толькі „дзеля мастацтва“ і грошай. Выпадак з Садоўскім павінен быць грознай перасьцярогай і для нас.

З тэатральнымі кадрамі ў Беларусі ня зусім добра. У БДТ-1 былі склокі. У тэатры Галубка было некалькі артыстых п‘яніц і распусьнікаў. У БДТ-2 былі выпадкі антысэмітызму, шовінізму. У большасьці тэатраў слаба разгорнута самакрытыка. Вельмі часта да новага жыцьця да барацьбы са сцэны клічуць «рабочыя» з пярсьцёнкамі, завушніцамі і манікюрам.

У трохмесячнік пролетарскай культуры комсамол, сумесна з усёй савецкай грамадзкасьцю, павінен дапамагчы нашым тэатрам разгарнуць соцыялістычным тэмпам рух наперад за пролетарскае мастацтва.

Тэатры і артыстыя павінны стаць умелымі і шчырымі мастацкімі агітатарамі за соцыялізм.

П. Шамшур.

(Канец будзе).

ЛІТАРАТУРНЫ КУТОК

Веч. Ранчынскі

Комуна ідзе.

. . . .
Шляхі цьвітуць!
Абымкамі пунцовымі,
Абвіты грудзі ўзбуджанай зямлі.
Пад грохат бур,
У вясновым парываньні
Па іх стагодзьдзі ў будучыню
йшлі.

Ня містыка,
Не карракты ва —
Эпоха йдэй нязнаных, найвялікшых.
Саўюць вянкі
Народы колектыву
Атруты цень ў абломках утапіўшы.
Як дзіўна жыць,
Калі краіна
Ймкнецца,
Творыць
І расьце!..
У агні сузор‘яў шалясьціць
Аквечаная рань
Сымфоніі жыцьця...

У кроках дзён
Напорнасьці поэмы —
Натхнёнасьць бур, бязьмежнасьці
віхораў...

На пругкіх крыльлях
Творчыя узьлёты
Акрэсьленага стылю будуючых
мільёнаў

Шляхі для іх!
Даволі марыць
Прыхільнікам Русі адзінай,
Што час
Абмые чырвань штандараў
узьнятых,

Што словы нашы
Растрасуцца ўхабамі пуціны —
І зьнікне пяршынство
Вялікіх мэт пролетарыяту.

Г-гэх, не!
Ніколі час
Ня зможа нас зрадніць
З шляхетным станам пухлай
зграі...

І наша мэта —
Плыць
І плыць!..
І кожны новы дзень мы спатыкаем
Каб несьці сьцяг
Рашучай барацьбы!
У сконах іх —
Напорны наш размах.
І дні
Не пабягуць назад..
Надыйдзе час
І злучнасьць мілая краін
Узыйдзе к небу дымам чорных
труб.

Пад музыку турбін
І сьвіст раменьняў-струн,
Жалезным крокам на парог
Камуна ступіць.

Браніслаўскі с-с. Жыткавіцкі р-ну Мазыршчана.

Я. Зорны

Комсамол

Мы вырасьлі
У гарце, запале,
Мы вырасьлі
У бурах завей,
І ня раз,
І ня раз
спатыкалі
галоднымі
чорны
дзень.
Ішлі,
зьнемагалі ў дарозе,
У гразь-жа
ня падалі
ніц.
Хваталі рукамі
Так многа
Вясёлых і яркіх
зарніц.

А зараз
Другія напевы,
А зараз
Інакшыя дні,
Гады чарадой
Праляцелі
А ў сэрцы ня гасьне
Уздым.
І сёньня
З вялікай
надзеяй
Да творчых ідзем
перамог
І новыя ветры
Нязнаныя гімны разносяць
У бязьмежных
колгасніх
палёх.

Васіль Бунтар

Зара імкненьняў

Восень жоўтая! Меднае полымя!
Залатая празрыстая шыр...
Зноўку еду жытнёвай палянай
З шчырай песьняй юнацкай душы.

Тут калісьці ў ліпнёвыя ночы
Расквітала жыцьцё быльняком,
Тут імкненьняў зара не аднойчы
Успывала за сіняй ракой.

Тут калісьці жытнёвае поле
Мае грудзі паіла агнём...
Не аднойчы пад сьпевы прывольля —
Піў жыцьцёвыя ўцехі па дно.

А сягоньня я зноўку ў вагоне.
Дзе-ні-дзе мільгацяць хутары,
А на родных жытнёвых загонах
Сінім дымам цьвітуць трактары!

А насустрач лясы ды балоты..
Загуляла празрыстая сінь,
Ды асеньніх лістоў пазалота
На заломаных пальцах асін!..

Магілеўшчына.

Адказ на дасланыя вершы

Вершы: „Зазімак“ і „Кастрычнік“—Ц. Крысько, „Сыгнал новаму жыцьцю“—М. Бандарчука, „Прыход зімы“—Р. Гарбацэвіча, „Дванаццаць“—М. З., „Беларусь“,—В. Лісаковіча, „О, прыдзе час“—П. Мініна, „Змаганьне“ — Крукоўскага, „Комсамолец“ і „Чырвоныя кавалі“—Я. Вашчанкі, „До кресцьянкі любешчей катерынкі“—І. Мазюкова, „Химия“, „Детство“, „На ловле“ і „Приход весны“—Х. Гіршава, „Восень“—С. Хаміцэвіча, „Ліпнёвыя напевы“—І. Гуцько, „Строім новае“ Ч. Д., „Даеш колгас“—К. Ткачова, „Восень“—Г. Зязюліна, „Шавец“ і „Кастрычнік“ — Белякова, „На сьмерць Паўлюка Труса“, „Будуйце колгасы“. „Вольха“ і „Зорка“—К. Мельнікава, „Лёс партызана“ і „Комсамолу Захаду“ — Я. Труса, „Чырвоны абоз“—С. Дворына, „Годзе нам смуціцца“—Я. Сіўчанкі, „Да працоўных навольных“,— Пад зарою слабодных“ і „Змаганьне за волю“—Я. Гарбачова, „Пра мар‘інскія балоты“—А. Ліхалапы, „Раньне на вёске“—П. Птушкін, „Цёмная ноч“—Ю. Хаміцэвіча, „Кастрычнік“—Трахіма Шанко, „Маладая восень“, „Гляджу туды“ і „Блат Гекер“—П. Марозава, і „Не хачу“—М. —друкавацца ня будуць.

Т. т. пачынаючыя вершам трэба па іпакшаму, не так як заметкай адбіваць падзеі жыцьця. У заметках гаворыцца аб выпадку ў вядомым месцы, вядомы час і аб вядомых асобах; верш-жа павінен абагульняць параскіданыя жыцьцёвыя факты і паказваць нам жыцьцё так, каб пад агульным, што завецца—тыпізаваным адбіткам жыцьця, чытачы маглі прыкмеціць і пазнаць блізкае і вядомае ўваходзячае ў верш. Тады гэты верш напісаны ў Гомельскай акрузе—будзе зразумелы і ў Мазырскай, і ў Менскай і ў інш.

Апрача таго, верш ніколі не павінен разьлічваць на перакананьні чытача разважаньнямі—гэта справа навукі. Верш павінен непасрэдна быць накіраван да пачуцьцяў чытача. Верш павінен альбо абураць нас (хоць бы супроць кулацкіх вылазак), альбо захапляць дасягненьнямі, перамогай (хоць-бы фабрычна-заводзкім і колектыўным будаўніцтвам), альбо выклікаць у нас спагаду (вядома не да кулакоў з нэпманамі), замілаваньня і г. д.

У вышэй-жа пададзеных вершах нічога гэтага няма. Так што гэтыя вершы не пераконваюць праўдзівасьці фактаў і не ўяўляюць сабой мастацкай цікавасьці. Каб унікнуць гэтага ў далейшым—сачэце за нашымі парадамі ў літстаронцы.

Т. П.

Заўсёды быць гатовымі

ПАЧЫН КОМСАМОЛЬСКАГА ВІЦЕБСКУ ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАДХОПЛЕН УСІМ ЛКСМБ

Пабудуем падводную лодку імя „Комсамолу"

Выклік віцебскіх актывістых

Актыў КСМ заводу «Чырвоны Мэталіст» у складзе таварышоў: Школьніка, Сімуніна, Бавельскага, Забяжынскага, Гіліна, Ноўкіна, Гуткіна, Нурынсона, Брыскер, Рольдзіна, Лечэ, Міркіна, Рубінштэйна, Рам, Казімір ва і Кішчэнка, разам з падшэфнай яму часткай авіобрыгады тав. Быстрова, Краўчэнка, Карчаніна, уносяць па 1 рублю на пабудову падводнай лодкі імя „Комсамолу" і выклікаюць актыў КСМ МББ чыгункі.

Актыў КСМ колектыву кооперацыйнага тэхнікуму ў складзе т. т. Федаровіча, Грушэўскай, Рубінштэйн, Краўчэнка; Басаў, Садоўскі, Рашкоў, уносяць па 50 кап. на пабудову лодкі імя «Комсамолу» і выклікаюць усе колектывы КСМ навучальных устаноў гор. Віцебску.

За практычную рэалізацыю пастаноў

Сучасныя абставіны патрабуюць ад комсамолу надзвычайна вялікай увагі па справе лепшай пастаноўкі вайсковай работы. Сьнежаньскі пленум ЦК УсеЛКСМ займаючыся абгаварэньнем пытаньня вайсковай работы, узяў на сябе адзін з баявых абавязкаў—пабудаваць падводную лодку імя „Комсамолу".

Віцебскі гарадзкі актыў КСМ 19 сьнежня, абгаварваючы вынікі работы пленуму па дакладу тав. Палякова, у сваёй пастанове адзначыў, што комсамол адабрае пастанову пленуму ў справе ўзяцьця на сябе абавязкаў пабудовы падводнай лодкі і ў сваёй пастанове актыў заклікаў усю організацыю да практычнай работы па збору сродкаў і адначасова выклікаў усе акругі Беларусі на хутчэйшы збор сродкаў і большае прыцягненьне працоўнай моладзі і КСМ да гэтай работы.

Практычна ажыцьцяўляючы пастановы актыву комсамольцы заводу „Чырвоны Мэталіст" у ліку 17 асоб адклікнуліся, унёсшы па аднаму рублю грошай на пабудову лодкі і выклікалі шэраг іншых колектываў. Выклік мэталістых паспрыяў організаваньню выклікаў на пабудову лодкі ўсіх колектываў і ў выніку рабочы працколектыву „Прогрэсу"—Гатаўскі там-жа на актыве ўнёс 1 рубель грошай і вызваў іншых таварышоў. Колектыў КСМ „Першае Мая" па выкліку мэталістых унёс ужо 10 рублёў.

Гэты пачын павінен значна штурхнуць усю організацыю Віцебску на выканальне пастановы ЦК.

ГУДКОВІЧ.

У рэдакцыю газэты „Чырвоная Зьмена"

Прашу рэдакцыю належачы мне ганарар за зьмешчаныя ў вашай газэце мае допісы здаць у фонд пабудовы падводнай лодкі імя „Комсамолу".

Віцебск. ГУТКОВІЧ

Макс Гэльц прыяжджае ў Віцебск

9-га студзеня з Вялікіх Лук у Віцебск прыедзе вызвалены па амністыі у Нямеччыне політ-зьняволены—кіраўнік саксонскай групы чырвоных франтавікоў Макс Гэльц, які прабудзе у Віцебску 3 дні. Для спатканьня вызначаны дэлегаты ад фабрык, заводаў і воінскіх часьцей.

ФІЗКУЛЬТУРА

Соцспаборніцтва Менск-Гомель

Гэтымі днямі Менскі акруговы савет фізкультуры выклікаў на соцспаборніцтва Гомельскі акруговы савет фізкультуры.

Галоўныя пункты соц. дагавору, які выставіў Менскі савет фізкультуры, наступныя: ачысьціць сіламі фізкультурнікаў у часе вясеньняй пасяўной кампаніі 25 ТЫСЯЧ ПУДОЎ НАСЕНЬНЯ, організаваць 130 ФІЗКУЛЬТУРНЫХ ГУРТКОЎ У САЎГАСАХ І КОЛГАСАХ, сабраць 1000 РУБЛЁЎ НА ТРАКТАР „ФІЗКУЛЬТУРНІК БССР", падрыхтаваць 100 ІНСТРУКТАРОЎ ФІЗКУЛЬТУРЫ З РАБОЧЫХ, БАТРАКОЎ І СЯЛЯН БЕДНЯКОЎ, ахапіць зарадкавай гімнастыкай ня менш 30 проц. рабочых, распаўсюдзіць інтэрнацыянальных марак на 1000 руб. і інш.

ФІЗКУЛЬТУРНУЮ БРЫГАДУ НА ДАПАМОГУ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ВЯСЕНЬНЯЙ ПАСЯЎНОЙ КАМПАНІІ

Прэзыдыум Менскага акруговага савету фізкультуры пастанавіў у хуткім часе паслаць у адзін з раёнаў Менскай акругі фізкультурную брыгаду з 10 чалавек, якая дапаможа ў падрыхтоўцы да вясеньняй пасяўной кампаніі.

З гэтай мэтай 10-га студзеня выяжджаюць у падшэфную вёску брыгада рабочых фізкультурнікаў з 10 чал. заводу „Дрэваапрацоўшчык".

СПАБОРНІЦТВА ПА КАНЬКАХ

Фізкультурны гурток пры МББ організоўвае ўнутрысаюзнае спаборніцтва па каньках, пасьля чаго 22-га студзеня адбудзецца соцспаборніцтва паміж гарадзкіх камандаў.

Соцспаборніцтва паміж фізкультурных гурткоў

Гэтымі днямі паміж фізкультурнымі гурткамі саюзу будаўнікоў і мэталістых заключана соцыялістычнае спаборніцтва. Гурткі ўзялі на сябе абавязкі організаваць па 3 фізкультурных гурткі ў колгасах, падрыхтаваць 10 чалавек інструктароў з рабочых, ачысьціць да вясеньняй пасяўной кампаніі ў падшэфных вёсках 1000 пудоў насеньня, організаваць на прадпрыемствах і пабудовах фізкультурныя ўдарныя брыгады, давесьці спазьненьні і прагулы паміж фізкультурнікаў да нуля і г. д.

З фото-апаратам па Гомелю

ПЯЦІМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ ДЛЯ КОЛГАСЬНІКАЎ

У Гомелі працуюць пяцімесячныя курсы. На курсах займаецца 89 чалавек рабочых, якія паедуць на сталую работу ў вёску. Курсы выпусьцяць старшынь колгасаў і актыў.



НА ЗДЫМКУ: занятки на курсах.

Юнкоры пішуць

СОТНІ ПУДОЎ ПОПЕЛУ НА ВУЛІЦЫ

Даўно ўжо надышоў сэзон топкі печаў, а аб зборы попелу ніхто не паклапаціўся. Неабходна камандаваньню і гаспадарчай частцы другога артпалка даць паказаньне і вызначыць месца для ссыпкі попелу.

У другім артпалку штогодна зьбіраецца сотні пудоў попелу, які высыпаецца на вуліцу. Зараз трэба падумаць аб зборы попелу і скарыстаць яго для ўгнаеньня глебы ў падшэфнай вёсцы з такім разьлікам, каб скончыць гэтую працу да вясновай пасеўнай кампаніі.

Вайскор № 3284/03.

АБЯЦАНКІ—ЦАЦАНКІ

Спачатку 1929 г. над Анапольскай ячэйкай ТДАвіяхіму ўзялі шэфства комсамольцы 38 кавалярыйскага палка. Яны шмат чым абяцалі дапамагчы ў працы ячэйкі. Праўда, далі нам падарунак, праціўгаз. Прыходзілі некалькі разоў праводзіць вайсковыя заняткі. Моладзь з вялікім захапленьнем і ахвотай уступала ў шэрагі ТСАвіяхіму.

Так работалі зусім нядоўга, усяго тыдняў 4-5, а пасьля, з надыходам лета, шэф забыўся пра свае абяцаньні. ЯчэйкаТСАвіахіму і вайсковы гурток распадаюцца.

ПРАЎДЗІВЫ.

За ўдарнасьць у лесазагатоўках

З вопыту мінулых гадоў вядома, што работа па лесазагатоўках мела шэраг недахопаў таму, што на гэтую працу мала звярачвалася ўвагі з боку сельсаветаў, камітэтаў сялянскай узаемадапамогі і партыйных організацый.

Трэба адзначыць, што ў мінулым годзе комсамольскія ячэйкі мала змагаліся за ізоляцыю кулацка-заможнай часткі вёскі ад удзелу ў лесазагатоўках.

Некаторыя чэйкі бачылі, як кулак пасылаў батрака з сваім канём ці даваў бедняку пілу і сякеру для працы, за што браў ад яго частку заработнай платы, а ячэйка на гэта не рэагавала.

У гэтым годзе перад Беларусьсю пастаўлена пытаньне аб найхутчэйшым выкананьні лесазагатоўчых плянаў, што патрабуе ад партыйнай і комсамольскай організацыі напружанасьці ўсіх сіл на гэты вучастак загатовак.

Ужо ёсьць прыклады, калі асобныя акругкомы і райкомы комсамолу прыступілі да вярбоўкі рабочых з мэтай пасылкі іх на лесазагатоўчыя вучасткі, комсамольцы зьяўляюцца ініцыятарамі організацыі ўдарных брыгад на лесазагатоўках, ініцыятарамі організацыі арцеляў з бядняцка-серадняцкай часткі насельніцтва, што павялічвае інтэнсыўнасьць працы ў выкананьні лесазагатоўчых плянаў.

ЯРОШ.

Працуем з посьпехам

З вялікім энтузіязмам Мазырская комсамольская організацыя ўзялася за праверку і мобілізацыю кадраў піонэр-працаўнікоў.

Пры АК створан акруговы штаб, у які ўваходзяць прадстаўнікі партыйных, профсаюзных і культурнасьветных устаноў.

Бюро Акругкому комсамолу пастанавіла павялічыць заданьне мобілізацыі новых кадраў на піонэрпрацу з 100 да 120 чалавек.

Створаны таксама брыгады пры АК якія выехалі ў раёны для правядзеньня ўсёй працы па праверцы і вылучэньні новых кадраў.

Піонэрская організацыя Мазыршчыны за пэрыод пасьля зьлёту пачала расьці надзвычайна шпаркімі тэмпамі.

Напрыклад, Нараўлянская організацыя, якая да зьлёту налічвала 125 піонэраў, зараз мае ў сваіх шэрагах звыш 500 піонэраў. Гэта самае мы наглядаем і ў шэрагу іншых раёнаў Мазыршчыны.

Організавана шмат новых піонэрскіх атрадаў. У гарадзкой організацыі 7 атрадаў, у Капаткевіцкай організацыі 6, у Нараўлянскай—3, у Юравіцкай—3 і некалькі атрадаў у іншых раёнах.

Ужо праверан склад піонэр-працаўнікоў па гораду.

Можна сьмела сказаць, што Мазырская організацыя з посьпехам выканае дырэктывы партыі, дырэктывы ЦК УсеЛКСМ і ЦК ЛКСМБ аб праверцы кіруючых кадраў піонэр-працаўнікоў і аб мобілізацыі новых кадраў на піонэрскую работу, а таксама рашэньні зьлёту аб падваеньні піонэрскай організацыі.

ЗАВАЛІКОЎ.

Паштовая скрынка

Аое—„Устрымаць хуліганаў", Комсамольцу — „Дзе „Легкая кавалерыя", К. Ц. — „Клясавы вораг шукае сабе гнязда". Наблюдацелю — „Скрыўленьне клясавай лініі на базе Саўторгфлёту" і „Неабходна прагнаць з работы гарадзкой станцыі", Зайцу — „Пазбавіць і выключыць", Бачыўшаму — „Такім ня месца", Ведаючаму — „Няма месца ў Саюзе", Лёгкаму Кавалярысту — „Вон палкі з соцыялістычнага каляса", Чачотцы — „Ці месца ў тэхнікуме", Аўтару допісу — „У мястэчку Колданава", Я. М. П. — „Трэба праверыць" і „Хто я", Кавалярысту — „Аб дыктатуры ў тэхнікуме". Зоркаму — „Бюрократ". Стэрліну — „Становішча ў інтэрнатах", Гаварушку — „Аб загадчыку школы", Голад і холад — „За кулацкую яешню страдае селянін", Унуку — Аб непатрэбных элемэнтах"—памянёныя допісы накіраваны ў адпаведныя ўстановы і організацыі для расьледваньня і прыняцьця адпаведных мер.

Харытончыку — „Аб працы мала хто ведае."—ня пойдзе таму, што аб гэтым ёсьць допіс другога юнкора.

Далецкаму — „Нядбайны ўчынак", Групе „ЛК"—„Нядбайнасьць ці злачынства", Воху — „Скажэньне клясавай лініі", Г. Варажыну — „Памылкі ячэйкі", Сымону Бярозе — „Актывіст-карцёжнік" і „Дачка нэпмана ў комсамоле", Комсамольцу — „Трэба яшчэ самому навучыцца". Усе гэтыя допісы накіраваны ў адпаведныя органы для расьледваньне і прыняцьця належных мер.

Фядзеенку — „Пра ячэйку Бельскага с.-г.". Ня пойдзе—дробязь.

Адказны рэдактар
А. Джэлюк

БІБЛІАГРАФІЯ

Маладняк № 10. Літаратурна-мастацкая і грамадзка-політычная часопісь—орган Беларускай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў. Выдавецтва „Чырвоная Зьмена", Менск-Кастрычнік—1929 г., ст. 136, цана 40 кап.

Апошнія нумары часопісу „Маладняк" сьведчаць аб тым, што сілы БелАПП'у з кожным месяцам мацнеюць і удасканальваюцца—як у сэнсе якасьці продукцыі мастацкіх і крытычных твораў, так і ў адносінах ідэолёгічна-пролетарскага асяродку.

У 10 нумары заканчваецца драма Рыгора Кобеца „Гута", канец якой, як і першыя дзеяньні сьведчыць аб вялікай актуальнасьці гэтага твору, аб вялікай здольнасьці пісьменьніка драматурга.

У драме адбіваецца наша значная перамога на соцыялістычным фронце, якая дасягаецца вялікай актыўнасьцю рабочых мас і ўсёй нашай грамадзкасьцю наогул. Станоўчыя гэроі драмы прасякнуты гарачай бадзёрасьцю і імкненьнем уперад. Адно трэба заўважыць Р. Кобецу, што ў драме сустракаецца шмат русыцызму і па-другое,—драма непазбаўлена некаторай тэндэнцыйнасьці.

Канец аповесьці „На абрэзках зямлі" С. Баранава таксама нічым нявызначаецца, як і ўся аповесьць у цэлым. Тэма аповесьці сучасная, сьвежая, але апрацоўка сюжэту вельмі слабая і не мастацкая. Кампазыцыя таксама прымітыўная. Самы канец аповесьці — дзёньнік увогуле слаба ўвязваецца з аповесьцю. Аповесьць чытаецца з натугай. Як дадатны бок аповесьці, можна лічыць слоўны матар'ял (багатая беларуская лексыка аўтара), хаця словы ў большасьці устарэлыя. У параўнаньні з мінулым, аповесьць „На абрэзках зямлі" сьведчыць аб вялікім дасягненьні пісьменьніка С. Баранава.

Кантура „Жорсткая дарога" Я. Скрыгана (Відука) на сваёй тэме досыць устарэлая. Яна адбівае часы наступленьня немцаў (1915 г.) і як да апошніх уцякала насельніцтва пакідаючы свае вёскі, свае хаты, і як гэта насельніцтва гінула, мерла ад голаду і раскідала трупы на дарогах розных губэрняў. Кантура напісана ўдала. Толькі адчуваецца нейкая рвучасьць у стылі, адчуваецца, што аўтар знаходзіцца пад уплывам футурызму.

Акрамя мастацкай прозы, у часопісі маецца тры вершы і адна поэма „Гарадок"—Юлі Таўбіна. Два з вершаў „Таварышу" А. Вечара і „На сьмерць Паўлюка Труса Зьмітра Астапенкі, прысьвечаны на сьмерць поэту Паўлюку Трусу. Абодва вершы прасякнуты гарачай чуласьцю да поэты.

Верш Валерыя Маракова мае вельмі вялікую мастацкую вартасьць, з глыбокай думкай, з палкім лірызмам, Але-ж у гэтым палкім лірызьме ёсьць вялікая доля незразумелага суму.

Юлі Таўбін у сваёй поэме „Гарадок" апявае стары, невялікі провінцыяльны гарадок. Ен вельмі чула да яго адносіцца і мастацка апісвае. Яму прыемна ўсё гарадзкое жыцьцё; комсамол, рост новых заводаў і гукі новых труб.

Але мабыць таму, што Ю. Таўбін захапляецца ўсім, ён у поэме не дае нічога вызначанага, сталага, аднаго. Уражаньне такое, што аўтар бачыў горад аднекуль здалёк.

З крытычных матар'ялаў у часопісі маецца: артыкул В. Бухаркіна — „Літаратуразнаўчыя вопыты проф. Барычэўскага", Б. Аршанскі— „Яўрэйская літаратура на Беларусі" і дзьве рэцэнзіі Н. Кабакова—Я. Ліманоўскі —„Над абрывам" і „Вясна"—штомесячны літаратурны дадатак да газ. „Комуніст", № 8, Бабруйск 30 жніўня 1929 г.

Асаблівую ўвагу заслугоўвае артыкул В. Бухаркіна „Літаратуразнаўчыя вопыты проф. Барычэўскага". У гэтым артыкуле аўтар па-марксыцку падыходзіць да разгляду дзьвёх прац проф. Барычэўскага: „Поэтыка літаратурных жанраў" і „Тэорыя сонэту". Побач з гэтым Бухаркін імкнецца даць марксыцкае вызначэньне прадмету літаратуры.

Вялікую каштоўнасьць мае і артыкул. Б. Аршанскага—„Яўрэйская літаратура на Беларусі". Аўтар у гістарычным разрэзе разглядае разьвіцьцё яўрэйскай літаратуры на Беларусі і вызначае яе месца сярод другіх нацыянальных літаратур.

С. К.

Менск, друкарня БДВ. Галоўлітбел 599